## § 26–27. Дзеянні ў наступленні

*Якія роды войскаў уваходзяць у склад Сухапутных войскаў? Назавіце асноўныя тактыка-тэхнічныя характарыстыкі БМП-2.*

**Наступальны бой. Наступленне** — від бою, які праводзіцца з мэтай разгрому праціўніка, авалодання вызначаным раёнам (рубяжом, аб’ектам) мясцовасці. Яно заключаецца ў паражэнні праціўніка ўсімі наяўнымі сродкамі, рашучай атацы, імклівым руху падраздзяленняў у глыбіню яго баявога парадку, знішчэнні і палоне жывой сілы, захопе ўзбраення, ваеннай тэхнікі і намечаных раёнаў (рубяжоў, аб’ектаў) мясцовасці.

Пад разгромам разумеецца нанясенне праціўніку такога ўрону, пры якім ён страчвае здольнасць да супраціўлення.

У час бою праціўніку наносіцца агнявое паражэнне, за якім ідзе рашучая атака яго пазіцый з наступным рухам у глыбіню абароны і праследаваннем тых, хто адступае. Пры гэтым знішчаецца жывая сіла і ваенная тэхніка праціўніка.

Поспех у наступальным баі могуць забяспечыць дакладнае ўзаемадзеянне ўсіх відаў войскаў, рашучасць дзеянняў, умелае і няспыннае кіраўніцтва дзеяннямі войскаў (мал. 108). Яму павінна папярэднічаць разведка абароны праціўніка з мэтай вызначэння слабых месцаў і сканцэнтраванне сіл і сродкаў на напрамку галоўнага ўдару, а таксама нечаканасць дзеянняў з захопам ініцыятывы на полі бою. Войскі павінны развіваць першапачатковы поспех, праследуючы ворага, які адступае.




Мал. 108. Фактары поспеху ў наступленні

**Сустрэчны бой** — разнавіднасць наступальнага бою, у якім абодва бакі імкнуцца выканаць пастаўленыя задачы наступленнем.

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки




Мал. 109. Разнавіднасці наступальнага бою

Мэта сустрэчнага бою заключаецца ў разгроме наступаючага праціўніка за кароткі тэрмін, захопе ініцыятывы і стварэнні спрыяльных умоў для далейшых дзеянняў. Ён можа ўзнікаць: у ходзе маршу — пры сустрэчы з выступаючым праціўнікам; у наступленні на праціўніка, які заняў абарону, — пры адбіцці контратак або сутыкненні з яго падраздзяленнямі, якія выступаюць для закрыцця брэшаў; у абароне — пры правядзенні контратак, а таксама ў шэрагу іншых выпадкаў.

**Праследаванне** — гэта неадступны рух за адыходзячым праціўнікам з мэтай яго захопу або знішчэння.

Праследаванне праводзіцца з задачай знішчэння або захопу праціўніка, які імкнецца пазбегнуць удараў (баявога кантакту) мотастралковых (танкавых) падраздзяленняў, якія абкружылі ці заблакіравалі дадзены раён (аб’ект).

Праследаванне можа ўзнікнуць:

— пры спробе праціўніка адысці ў момант баявога сутыкнення падраздзяленняў з ім;

— у выніку прарыву з акружэння або з блакіраванага раёна;

— пры спробе ўцячы ад пошукавай групы ў момант пошуку;

— пры адыходзе пасля здзяйснення дыверсій.

**Дзеянні салдата ў наступленні.** У наступленні салдат дзейнічае ў складзе мотастралковага аддзялення. Задачу на наступленне ён атрымлівае ад камандзіра аддзялення. Атрымаўшы баявую задачу, ён павінен усвядоміць для сябе арыенціры на полі бою, стан, састаў і характар дзеянняў праціўніка, месца знаходжання яго агнявых сродкаў, задачу ўзвода, аддзялення і сваю задачу.

Салдат павінен ведаць сваё месца ў ланцугу аддзялення (мал. 110), цэлі для паражэння і парадак вядзення агню, нумар танка, за якім будзе дзейнічаць аддзяленне, яго апазнавальны знак, парадак узаемадзеяння з ім, а таксама парадак выкарыстання агню артылерыі і іншых агнявых сродкаў. Неабходна таксама ведаць месца і парадак спешвання з БМП (БТР), парадак пераадолення загароджанняў і пе-

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки




Мал. 110. Мотастралковае аддзяленне наступае ў ланцугу (СС — старшы стралок; К — кулямётчык; КА — камандзір аддзялення; Г — гранатамётчык; ПГ — памочнік гранатамётчыка; Сн — снайпер)

*Назавіце агнявыя сродкі, якія прымяняюцца мотастралковым аддзяленнем у агульнавайсковым баі.*

рашкод, сігналы апавяшчэння, кіравання і ўзаемадзеяння, час гатоўнасці да наступлення.

Паспяховыя дзеянні салдата ў баі ў многім залежаць ад таго, як ён рыхтуецца да наступлення. Ён павінен праверыць спраўнасць зброі і падрыхтаваць яе к бою, праверыць наяўнасць боепрыпасаў (пры неабходнасці папоўніць іх запас), спраўнасць сродкаў індывідуальнай засцярогі і падрыхтаваць сабе прыладу для хуткага выскоквання з акопа — абуладкаваць прыступкі ці заглыбленні ў пярэдняй сценцы акопа (траншэі).

Пры падрыхтоўцы да наступлення ўначы салдат, акрамя таго, вывучае мясцовасць у напрамку руху, запамінае мясцовыя аб’екты, якія могуць служыць арыенцірамі ўначы, вывучае напрамак руху па азімуце. Салдаты, якія маюць зброю з начнымі прыцэламі, правяраюць іх. Для карэкціроўкі агню ў цёмны час магазіны дадаткова забяспечваюцца патронамі з трасіруючымі кулямі.

Да пачатку атакі салдат вядзе па праціўніку агонь са стралковай зброі. З падыходам танкаў на зыходную пазіцыю для наступлення па камандзе «Аддзяленне, падрыхтавацца да атакі» ён дазараджае зброю і падрыхтоўвае гранаты, затым далучае да аўтамата штык-нож, устанаўлівае прыцэл «П» або 3 і замацоўвае прадметы рыштунку так, каб яны не перашкаджалі руху.

Пасля праходжання танкаў салдат ставіць нагу на прыступку (у заглыбленне) і ўпіраецца рукамі ў бруствер акопа ў гатоўнасці хутка пакінуць яго. Назіранне за праціўнікам пры гэтым не спыняецца. Па камандзе «Аддзяленне, у атаку — наперад» салдат адначасова з іншымі салдатамі хутка выскоквае з акопа (траншэі)

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

і рухаецца наперад бягом ці паскораным крокам у ланцугу аддзялення неадступна за танкам, а дзе яго няма — самастойна пры падтрымцы агню БМП (БТР).

Пры руху ў ланцугу аддзялення салдат вытрымлівае пэўны інтэрвал і сваім агнём знішчае агнявыя сродкі праціўніка, у першую чаргу процітанкавыя. Наблізіўшыся да траншэі, занятай праціўнікам, на 25—40 м, ён, не запавольваючы руху, кідае ручную гранату ў траншэю, затым імклівым кідком з крыкам «УРА!» пераадольвае астатнюю адлегласць. Праціўніка, які ўцалеў на пярэднім краі, салдат, не спускаючыся ў траншэю, знішчае агнём ва ўпор, ручнымі гранатамі ці ў рукапашнай схватцы і, не спыняючыся, рухаецца ў вызначаным напрамку.

У час атакі салдат знішчае праціўніка агнём на хаду, з кароткіх прыпынкаў і ва ўпор, ручнымі гранатамі, штыком і прыкладам.

**Пераадоленне мінна-выбуховых загароджанняў.** Пераадоленне мінна-выбуховых і іншых загароджанняў аддзяленнем у час атакі ажыццяўляецца, як правіла, услед за танкам або за баявымі машынамі пяхоты (мал. 111).

З падыходам асабовага саставу да інжынерных загароджанняў па камандзе камандзіра ўзвода ***«Узвод, у напрамку*** (указваецца аб'ект)




Мал. 111. Варыянт пераадолення мінна-выбуховых загароджанняў мотастралковым аддзяленнем

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

***накіроўваючае — першае аддзяленне, у праход, бягом — МАРШ»*** або ***«Узвод, у напрамку*** (указваецца аб’ект), ***па праходзе ў калону па тры (па два), за танкам бягом — МАРШ»*** аддзяленні па баявых групах ці ў поўным складзе ў вызначаным парадку пераадольваюць загароджанні. Пры пераадоленні загароджанняў у поўным складзе салдаты перастройваюцца з ланцуга аддзялення ў калону па тры (па два) згодна з баявым разлікам і пераадольваюць загароджанні.

Пры падыходзе даміннага поля па камандзе камандзіра ўзвода або самастойна камандзір аддзялення падае каманду: ***«Манеўраная група, у праход, на рубеж*** (указваецца прамежкавы рубеж), ***бягом — МАРШ».*** Пры пераадоленні міннага поля ў складзе аддзялення камандзір аддзялення падае каманду: ***«Аддзяленне, у напрамку*** (указваецца аб’ект) ***па праходзе ў калону па адным (па два), за танкам бягом — МАРШ»*** або ***«Аддзяленне, за мной, па праходзе ў калону па адным (па два), бягом — МАРШ».***

Манеўраная група (аддзяленне ў поўным складзе) пад прыкрыццём агню агнявой групы і баявой машыны пяхоты (іншых аддзяленняў і баявых машын) пераадольвае міннае поле, займае ўказаны рубеж і прыцэльным агнём прыкрывае пераадоленне загароджання агнявой групай (іншымі аддзяленнямі).

Пасля пераадолення інжынерных загароджанняў мотастралковае аддзяленне, якое наступае ў пешым парадку, па камандзе камандзіра аддзялення ***«Аддзяленне, у напрамку*** (указваецца аб’ект) ***к бою — НАПЕРАД»*** або ***«Аддзяленне, за мной, к бою — НАПЕРАД»*** у вызначаным парадку разгортваецца ў баявы парадак, адкрывае агонь са сваёй зброі і імкліва атакуе праціўніка.

Баявая машына пяхоты (бронетранспарцёр) пераадольвае міннае поле за мотастралкамі пад іх агнявым прыкрыццём.

1. Што такое наступальны бой?
2. Якія фактары поспеху ў наступальным баі?
3. У чым заключаецца падрыхтоўка салдата перад боем?
4. Як салдат павінен дзейнічаць пасля сігналу да атакі?
5. Як ажыццяўляецца пераадоленне аддзяленнем мінна-выбуховых і іншых загароджанняў у ходзе атакі?
6. Якія каманды падае камандзір узвода з падыходам асабовага саставу да інжынерных загароджанняў?
7. Якія каманды падае камандзір узвода з падыходам асабовага саставу да міннага поля?

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки